***Эвеліна Шчадрына***

## ТРАДЫЦЫІ ЭТНІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ЯК АСНОВА СТАБІЛЬНАСЦІ ЭТНАЭКАЛОГІІ НАРОДА

Аснова, ядро культуры – традыцыі, якія вызначаюць яе накіраванасць, структуру і забяспечваюць захаванне. Словы «культура» і «традыцыя» часам ужываюць як сінонімы, што не зусім дакладна. Уласна пад словам «т р а д ы ц ы я » маюць на ўвазе *генетычна стабільны, ураўнаважаны, самадастатковы лад жыцця*. Носьбіты яго забяспечваюць усе свае патрэбы выключна пераймannем структуры ладу жыцця старэйшых генерацый. У XXI стагоддзі ўвага даследчыкаў-гуманітарыяў да традыцыі беларусаў, да каранёвай беларускай культуры адчувальна расце. Усім, каму не абыякава захаванне беларусаў як народа, цікава перш-наперш э т н а э к а л а г і ч н а с ц ь іх традыцыйнай культуры.

Гарадская, урбаністычная культура Беларусі заўсёды была досыць стандартнай для Усходняй Еўропы. Тое, што робіць беларусаў беларусамі, збольшага месціцца ў т.зв. народнай, вясковай культуры – аўтэнтычным фальклоры нашага народа. Менавіта ён, а не нешта іншае, на мой погляд, мае ўсе падставы на прыярытэт у дэфініцыі «беларуская культура». Традыцыйная культура Беларусі – культура яе руральных (вясковых, земляробчых) асяродкаў – даіснавала да XXI стагоддзя. Самакаштоўныя і дастатковыя для самазахавання народа жыццёвая мудрасць, этыка, мараль, экалагічнасць светапогляду, «адфільтраваныя» стагоддзямі – дагэтуль існуюць у светасузіранні і паводзінных мадэлях жыхароў нашых руральных асяродкаў. Гэта з'яўляецца сведчаннем надзвычайнай трываласці, вялікага этнаэкалагічнага патэнцыялу беларускай традыцыйнай культуры, што не павінна застацца па-за ўвагай работнікаў сацыяльнай сферы ў XXI стагоддзі, стагоддзі т.зв. «антрапалагічнага крызісу».

Спалучыць этнаэкалагічны патэнцыял сваёй каранёвай традыцыі з новымі формамі адаптацыйнай стратэгіі, выжывання ў асяродку інфармацыйных грамадстваў – задача складаная, але толькі яе вырашэнне дазволіць народу захавацца ў выглядзе адмысловай этнічнай адзінкі і пазбегнуць шэрагу сацыяльных, экалагічных, дэмаграфічных складанасцей.

Асабліва паслядоўна выкладзена думка, што народ не здольны існаваць у непашкоджаным ландшафце без захавання ўласных культурных традыцый, у працах этнолага, гісторыка, географа і культуролага Льва Гумілёва. Згодна з яго высновамі, страта каранёвай культуры – першая прыступка на шляху да этнічнай і, неўзабаве, экалагічнай катастрофы, пасля якой ландшафт (пазбаўлены масавага жыхара – чалавека, сканцэнтраванага напярэдадні катастрофы ў цэнтрах-мегаполісах) прымае свой першапачатковы («цнатлівы») выгляд. Але жыць у ім будуць ужо зусім іншыя людзі. Сам працэс звычайна займае не адно стагоддзе, але яго працягласць не ўплывае на канчатковы вынік.

У XXI стагоддзі асяродак жыццядзейнасці чалавека, які яго фарміруе, залежыць ад шматлікіх фактараў. На ўзроўні культуры пэўнай народнасці, этнічнай культуры асяродак існавання людзей вызначаны географам, гісторыкам, этнографам і культуролагам Львом Гумілёвым як б і я ц э н о з . Сярод складаючых біяцэноза [1, с.101]: *ландшафт, флора і фаўна,* чалавечая супольнасць, якая жыве ў гэтым ландшафце *(этнас) і штучны ландшафт,* які людзі ствараюць у месцах свайго «канцэнтраванага» жыхарства – *ландшафт урбанізаваных населеных пунктаў – гарадоў.* Пры падтрымцы баланса паміж гэтымі складаючымі парадак, магчымасць супольнага існавання членаў біяцэноза захоўваецца невызначана доўга. Баланс гэты закладзены звычайна ў каранёвай культуры этнасу – народнай, у выпадку Беларусі – у культуры тытульнага этнасу – беларускім аўтэнтычным фальклоры. Пры адсутнасці кантроля, рэгулявання мадэлей паводзінаў людзей, накіраваных на падтрымку парадка, баланс парушаецца, антыэкалагічныя паводзіны супольнасці заканчваюцца сацыякультурнай катастрофай, вынікі якой у роўнай ступені закранаюць інтарэсы ўсіх культурных і этнічных груп, якія пражываюць на агульнай тэрыторыі біяцэнозу – ў этнічным ландшафце.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, палітыка дзяржавы накіравана на с т в а р э н н е ў м о ў, я к і я з а б я с п е ч в а ю ц ь д а с т о й н а е ж ы ц ц ё я е г р а м а д з я н [2, с.14]. Гэта – адна з галоўных мэт органаў кіравання сацыяльнай сферай увогуле і культурай у тым ліку. Зыходзячы з выкладзенага вышэй, відавочна, што аналіз сучаснага стану традыцыйнай беларускай культуры, аўтэнтычнага фальклору – заўсёды важны пры вызначэнні доўгачасовых прыярытэтаў у грамадскім кіраванні, асабліва, калі ўлічваць праблемы этнаэкалогіі, інфармацыйнай бяспекі, дэмаграфіі, якія ў час мілеліуму стаяць перад Рэспублікай.

Органы дзяржаўнага кіравання культурай РБ, ствараючы ў XXI стагодзі спрыяльны этнаэкалагічны асяродак для свайго народа і доўгатэрміновага стабільнага захавання і развіцця культуры ў н а й б о л ь ш а г у л ь н ы х м э т а х уласнай д з е й н а с ц і павінны спрыяць: умацаванню вобраза краіны (жыццёвага ландшафту супольнасці) як дома ў свядомасці яе народа; стабілізацыі мадэляў грамадскіх паводзін,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіраваных на захаванне інтэграванай сферы каштоўнасцей і сімвалаў каранёвай культуры нашага народа (яго фальклору), вакол якіх канцэнтруецца этнаэкалагічная энергія тытульнага этнасу Беларусі.

**Спіс літаратуры:**


1. Гумилёв, Л.Н. Этногенез и биосфера земли / Л.Н. Гумилёв. – М. : АСТ, 2001. – 320 с.
Конституция Республики Беларусь 1994 г. (с изм. и доп.). – Минск, 2005. – 46 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ